**Ірына Жарнасек**

# ШУКАЮ ЦЯБЕ

***Вершы***

KAMUNIKAT.org

**Мінск**
**2008**
**Про Хрысто**

**ЗМЕСТ**

Рараты
Снежаньскае
Тваё Аблічча
Плакала Маці...
Дзеля гэтае хвіліны
Здрада
Давяраюся Табе
Святы Юзаф
Росіца
Шукаю Цябе...
Сон
Страта
Літанія
Святая Тэрэса з Лізье
Просьба
*У самоце маёй...*
Ачышчэнне
Няскончаная размова
Ты пазнаеш?
*Прыхінуся да дрэўка крыжа...*
Шчодрасць.
Горыч несустрэчы
Любоў
Тваё Сэрца
Пад зоркай з пахмурнага неба
Спадзяванне
Пра мяне
Пад несвяточнай ясёнкаю
Галубка
Надзея
Важнае
Спадак
Шчасце
*Язміну з твайго гародчыка...*
Успамін
Каляднік
*На падваконні барака...*
Падзяка
Размова з гаспадаром бульдога
Крыўда
Лесвіца
Карціна, якой пакуль няма
Дарога
З дапамогай святога Антонія
Малітва Божага дзіцяці

**Рараты ***

Кволы агеньчык свечкі
далоні трымаюць хлапечыя,
а побач –
яшчэ і яшчэ...
Дзівоснай красы ліхтарыкі
заззялі зіхоткім святлом
і асвяцілі дом Божы
на досвітку гэткім марозным.

Рараты...

О Езу, на зямлю прыйдзі,
спашлі для нас збаўленне...

Свечка
ў руках хлапчаняці
просіць у Бога апекі:
для мамы –
яна, бедачына,
не можа ніяк прачнуцца
гэтым марозным ранкам,
каб разам з маленькім сынам
ісці ратаваць свой Край;
для таты –
ён без настрою:
палучка яшчэ далёка,
кішэні ж даўно пустыя
і пахмяліцца так хочацца
пасля ўчарашняе п'янкі.

Рараты...

Нясе сваю свечку хлапчук –
не дыхае,
каб не пагасла
святло трапяткое, дрыготкае –
яно так патрэбна сягоння,
каб выслухаў Пан Бог малітвы
яго і старэнькай бабулі,
што дзесьці на лаўцы мовіць
просьбы свае да Бога...

Рараты...

Звоняць званы святыні.
Краіна застыла ў чаканні
прыходу Таго,
Хто прыйсці павінен
і ашчасліваць зямлю,
якая нават не ведае,
чаго не стае
ёй
для шчасця.

Рараты...

Краю, мой Краю,
хто і калі цябе разгадае?

Звоняць званы.
Ды ў ложках
соладка спяць сном глыбокім
не дзеці,

але іхнія таты і мамы.

Ім для таго, каб прачнуцца,
што яшчэ трэба, Божа?!

Ды ўсё ж не памерла надзея.
Бо дзеці, іхнія дзеці
гэтым марозным ранкам
са свечкамі й ліхтарамі,
з малітвай даверу на вуснах
ідуць ратаваць свой Край.

Рараты...

**Святая Імша ў Адвэнце ў Каталіцкім Касцёле. Яна адпраўляецца на досвітку ў гонар Маці Божай.*

**Снежаньскае**

У снежнай завеі
згубіліся дзеі,
згубіліся словы,
і вочы нічога не бачаць
наўкола –
суцэльная замець.
Нібыта нязручна,
нібыта сцюдзёна,
і хата святлом сваім вабіць.
Ды толькі ў той хаце
зноў знойдуцца словы,
і вочы нямыя прадметы ўбачаць.
І стане так сумна,
так горка і скрушна

у вернутай яве,
што сэрца папросіцца зноўку
на волю,
у сцюжу завейную,
дзе вечнае неба
крыллем анельскім страсае
сняжынкі
на нашыя сцежкі зямныя.
І ў гэтай шчаслівай самоце,
у снежнай віхуры завейнай
убачыш... адзіную зорку,
што кліча цябе
ў Бэтлеем.

**Тваё Аблічча**

Вось думаю, Хрыстэ,
я грэшная,
бо часам прэтэнзіі маю
да тых, што Тваё Аблічча
на палатне суворым
малююць пэндзлем і талентам,
фарбамі рознага колеру.
Яны, вядома ж, смелыя,
вядома, адвагу маюць,
бо Аблічча Тваё
для ўсіх нас
старannай рукой вымалёўваюць.
І хочуць зрабіць як найлепей –
прыгожа, добрымі фарбамі...
Дык, значыць, сама вінаватая,
калі з тых палотнаў руплівых
Цябе мае кепскія вочы

не бачаць заўсёды, мой Божа?..

І часта,
калі размаўляю з Табою,
мой позірк плыве чамусьці
да яблыні ў бацькавым садзе,
да дзьмухаўца адзінокага
на тонкай і кволай ножцы,
на прыдарожны трыпутнік
пры самай зямлі, амаль пад нагамі...
На верхавіну высознага клёна,
дзе старая бусліха корміць
няўмелых сваіх буслянятак.
Тады раптам з квецені луга,
з кашлатых ялінавых лапаў,
з аголенай восеньскай нівы,
сумнай, але з абяцаннем
чагосьці яшчэ на прышласць,
з камякоў сцюдзёнага снегу
на арабіне чырвонай,
нібы кроплі чыёйсьці крыві,
праступіць Тваё Аблічча...

Хто нябачны Яго вымалёўвае?
Якімі адметнымі фарбамі?
Скуль натхненне бярэ той мастак?
І ўкленчыць тады гэтак хочацца
прад кожным лістком і травінкаю,
высокай гарою і чыстаю
празрыстай, сьцюдзёнай крыніцаю,
адкуль на мяне ўзіраюцца
вочы Твае, о мой Езу,
з нястворанага
нікім Аблічча.

**Плакала Маці...**

Хлопцы спрачаліся:
няўжо гэткі меткі, няўжо гэткі ўдалы,
што за тры стрэлы пацэліць
у галаву Маці Божай,
па той самай фігуры, што ўпарта,
нібыта маўклівы дакор невядома каму
засталася надоўга стаяць
на руінах старога касцёла?
Ён жа, удалы і смелы,
настойваў: пацэлю! Кажу вам – пацэлю!

І...стрэліў.
І ссек вершаліну бярозкі,
што расла на касцельнай сцяне,
захінаючы Маці Божую сваёй кволай засенню.

Стрэліў яшчэ: ад сцяны адшчапіўся камень
і з грукатам, бы валун-велікан, зрынуўся ўніз,
на друз, пад якім спачывалі мніхі,
што калісьці Імшу справавалі ў гэтым касцёле.

За трэцім разам пацэліў.
І ад шчасця сваёй перамогі...
не заўважыў слязы,
што сцякла па шчацэ Маці Божай
на пясок, які покрывам тоўстым
засыпаў Яе алтар.

Плакала Маці па дзецях,
а яны шапкі ўгору кідалі,
святкуючы перамогу

над Ёй,
маўклівай і горка-журботнай.

Плакала Маці па дзецях,
аплаквала іхняе заўтра,
якое кудысьці знікла,
каб ужо не вярнуцца, напэўна,
да тых, што страляюць метка...

## Дзеля гэтае хвіліны

Сярод густых кашлатых елак –
святло з высокага й малога
ваконца
самотнае святыні.
Тут правіцца Імша.
Святар у доўгім паліто,
што з-пад арнату выглядае,
з дрыготкімі й чырвонымі
ад холаду рукамі
і з голасам прастуджаным, глухім.
Яшчэ народ:
бабулькі – тры,
што ў доўгую дарогу
даўно сабралі рэчы,
ды й маладзіца, якой учора
прысніўся страшны сон...
Сцюдзёны й цёмны
даўно спусціўся вечар
на гэтую зямлю,
і ў хатах людзі,
павячэраўшы,
збіраюцца да сну.

Звычайна ўсё.
Як і ўчора, сёння й заўтра,
якое, пэўна ж, прыйдзе
шэрым ранкам лістапада,
пакліча іх усіх да працы,
каб, сцершы дзень,
зноў прычакаць змяркання
ды вечара глыбокага,
начы...

І ў змроку гэтым –
шэрым і звычайным –
сярод кашлатых елак,
у старой святыні
Імша заўсёды будзе.
Бо не адступіцца святар,
якога сцюжа пачасту даймае.
Хоць бы й дзеля таго,
каб хтосьці з іх,
аднойчы зблытаўшы
расклад быцця свайго,
пераступіў парог святыні
ды, скалануўшыся нутром,
сагнуў свае нягнуткія калені
і зразумеў,
што дзеля гэтае хвіліны
ён жыў.

## **Здрада**

Калі б мая любоў
была трывалаю –
сэрцам усім,

душою і думкамі ўсімі,
такою, якой Ты прагнеш...

Калі б вернай была
і ніколі Табе не здраджвала...
Ні тады,
калі Ты ў Бэтлееме
усмешкаю свет асвятляеш.
Ні тады,
калі ў плашчы пурпуровым –
на смех і пагарду цэламу свету...
Ні тады,
калі да бэлькі нямой
рукі Твае прыбівалі...

Прыбілі...
разам з Табою мяне да крыжа.
Але Ты з яго ўваскрасаеш!
Я ж пакідаю наш крыж,
бо здраджваю
Табе,
нашаму з Табою крыжу
і майму ўваскрашэнню.

**Давяраюся Табе**

Твой дакор у вачах з абраза...

Зноў аб яго спатыкаюся
і набіваю гузак,
якога не чую пальцамі,
не лячу кампрэсам,
ён баліць дзесь глыбей –

на сподзе душы...
Што ізноў у мяне не так?
Дзе ізноў я была няўдзячнаю?

Далікатны дакор з абраза...
Чым Табе за яго аддзячу я?

## Святы Юзаф

Любоў. Пакора.
Чысціня і святасць.
Цяжар на сэрцы.
Болю невымоўнасць.
Бязмежнасць вернасці.
Цярплівасць і цярпенне.
Усё гэта – ягонае жыццё.
І – ціхі-ціхі,
непрыкметны
адыход...

Так сцвердзіліся на вякі
высакароднасць і любоў.

## Росіца

Малітва на вуснах застыла.
Ружанец рука затрымала.
Да Бога душа узляцела
з пакутаў, мучэнняў, ахвяры.

Зіма дарэшты счарнела,
сцюжа полымем плача:

у Росіцы анямелай
усмешкі на твары не ўбачыш.

Якія усмешкі? Росіца
застыла ў жалобным адчаі –
попелам жудасным моліцца,
зямлю напаіўшы слязамі.

Вецер галосіць у Росіцы,
вецер хаўтуры спраўляе,
моліцца ўсцяж па нябожчыках,
якія ў пакутах сканалі:

«Божа ласкавы, злітуйся!
Стогне зямля ахвярамі.
Росіца стала пакутніцай...
Вечны спачын дай ім, Пане!..

Прымі ў Айчыну светлую
з пекла, якое спазналі
ў гэтым жыцці ад нелюдзяў...
Вечны спачын дай ім, Пане!..

На іхніх вуснах малітва
была пры апошнім дыханні...
З імем Тваім адыходзілі...
Вечны спачын дай ім, Пане!..»

...Малітва на вуснах застыла.
Ружанец рука затрымала.
Да Бога душа узляцела
з пакутаў, мучэнняў, ахвяры...

## Шукаю Цябе

Шукаю Цябе ў паднябессі далёкім,
скляпеннях сінечы над галавой,
шукаю на вулках, змрочных і вузкіх,
шукаю ў святынях, гатычных, высозных,
шукаю ў капліцах і ля крыжоў.
Шукаю ў тварах, блізкіх і родных,
прыветных усмешках, далонях сяброў.
У снег і завею, слату і нягоду
сонечным днём, у маўклівую ноч...
Шукаю Цябе, бо ведаю добра:
Ты дзесьці ёсць блізка –
зрабіць толькі крок...

Шукаю, мой Божа, Цябе гэтак доўга,
забыўшы, што ўсё да крупінкі,
усё да апошняе кроплі
пры мне, ува мне, па-за мною –
гэта ўсё — Ты.

## Сон

Аднойчы ў сне
па дрогкай дарозе
мяне коні імчалі наўскач
кудысьці з вяршыні гары —
у нязнаную далеч,
туды, дзе знікаў мой далягляд
і ў нечым
жахліва-сцюдзёным, гаркотным
ён меў нежаданы працяг.
З пашчы яго дыхаў сівер і лёд,

KAMUNIKAT.org

і сэрца маё было дзесь па-за мною,
а ўва мне
толькі холад імклівы
і страх...

Тады быў мне голас:
«Ідзі за Хрыстом, і Ён не пакіне цябе».
«Ах, нешта ж пакінуў!» — гукнула ў адказ і...
змярцвела,
бо гэта было нараканне.
Ды голас здалечы ізноў загучаў:
«Няпраўда.
Ён даў табе ляску, з ёю ідзі...»

...Коні суцішылі бег,
ужо не імчалі болей.
Дарога паволі плыла,
я сунімала дыханне...
А ў скронях бомам звінела:
«Што гэта, «ляска»? Дзе яна? Дзе?»

Адказ прыйшоў на світанні.
Ляска, якую Ён даў,
Божаю ласкай завецца.
З ёю ідзі.
І не зведаеш болей самоты.

**Страта**

Яшчэ зусім нядаўна
бачыла Тваю ўсмешку,
Твой позірк — толькі для мяне.

Ды мой пагляд
паплыў кудысь далей:
да вачэй, лагодных і злых,
да гэткіх няшчырых усмешак,
што знепрыгожваюць
твары людскія.
Да страху,
што забірае ўсю на сябе ўвагу,
да знікомых, агромністых
гмахаў
так патрэбнага нам дабрабыту...

І... згубіла Тваю ўсмешку,
дарагі падарунак,
прызначаны аднойчы
для мяне.

**Літанія**

На бэльках сівога крыжа
вераб'і, як артысты на сцэне,
вядуць бесклапотную песню.
Ды кожнага майскага вечара
на траве, ля падножжа крыжа
свой спеў пачынаюць і людзі:
«Кірые, элейсон...»*

За іхнімі спінамі — трактар,
матацыкліст бесклапотны
загрыміць вецярком шалёным...
Але той, хто тут стаў на калені,
не зважае,
бо свой мае пільны клопат:

«Ойча з неба, Божа,
змілуйся над намі».
Птушкі спачатку прыціхнуць
у шыпшыне духмянай,
а потым —
чаго ж ім баяцца, пяюхам? —
і... разам з людзьмі:
«Святая Марыя, —
з просьбай умольнай да неба: —
маліся, Марыя, за нас!»

Кот пры хляве, як заўсёды,
ціхутка схлябтаў малако ды мыецца —
надчэквае ў хату гасцей.
Спевам натхнёным прываблены,
падбег, прысеў крышку воддаль,
заплюшчыў вочы ды слухае:
«Маці добрай рады... —
дружная просьба-уздых: —
за нас маліся, Марыя».

Бабулька на лаўцы пры хаце,
не мае, старая, сілаў
дайсці да крыжа прыдарожнага,
а вось жа яшчэ нядаўна
ён быў гэтак блізка, побач зусім...
«Панна ласкавая... верная...—
слёзы, што тыя гарошыны, —
...за нас маліся... Марыя...»

Малы ў пяску з самазвалам
буксуе — цяжкая праца,
мурзаты, а мыцца вось часу не мае,
бо трэба яму неадкладна

давезці груз вельмі важны.
В-в-ву-ух! Нарэшце мінулася
бездараж!
«Прычына нашае радасці,
маліся за нас, Марыя!»

П’янтос вясковы:
да гэтага часу, бядота,
не знайшоў чамусьці нагоды
заўважыць
крыж пры дарозе...
А тут прыслухаўся — што гэта?
«Лекарка хворых, —
умольная просьба, —
маліся за нас, Марыя».
Сціснула сэрца прапітае
нязнанай раней гаркотаю:
«І за мяне, неразумнага, —
выцер ён шапкаю вочы, —
Прытулак грэшных, маліся...»

«Суцяшэнне журботных...»
Марыя...
«Каралева анёлаў...»
Марыя...
Святая, добрая Маці,
маліся, просім, за нас!

Вецер дыхнуў, і пялёсткі півоняў,
што ўпрыгожвалі крыж прыдарожны,
сыпнулі, нібы ў часе працэсіі, долу,
на галовы людзей,
што кленчаць каля яго падножжа.

Чыю ты пачула просьбу,
Найсвяцейшая Панна Марыя,
гэтым травеньскім вечарам?

*Пане, змілуйся...(*з грэцк.*)

**Святая Тэрэса з Лізье**

Дождж з ружаў,
якім ты зямлю акрапляеш, —
гэта твая ўсмешка.
Яна плыве праз стагоддзі,
праз тоўстыя сцены,
гару Кармэль —
на нашыя сумныя твары,
што радасці не спазналі.

Ды й дзе ж тут спазнаеш
жаданую радасць,
не зведаўшы
цішы малітвы
сцюдзёных кляштарных сценаў,
гулкіх і доўгіх,
як вокам акінуць
у зіхоткім святле адзінокае свечкі,
калідораў.
Не пачуўшы
маўклівага голасу,
што прамаўляе аднойчы
да сваіх выбраных
з гары прарока...
З гары,
дзе сам Бог жыве,

KAMUNIKAT.org

прад Абліччам якога...

«...хто, святая Тэрэса?» —
«Кожны мой брат і сястра,
кожны, хто нават таго не ведае...»

Тэрэса, святая Тэрэса!
Дзяўчынка, кармэлітанка!
Не парань сваіх босых ножак,
калі пойдзеш збіраць тыя ружы,
каб потым пялёсткамі кветак
асыпаць маю душу.

**Просьба**

Святы Арханёле Міхале,
з мячом гэткім гострым і праведным!
На варце майго народу,
людзей, што людзьмі хочуць звацца
і часта так забываюць,
што быць чалавекам няпроста,
бо свінні часам пануюць рупліва,
што прынялі аднойчы ў Гадары
д'ябла ў свае чэравы...

Святы Арханёле Міхале!
Калі гэткі час настане,
што не Богу
а д'яблу мы паклонімся зноў —
не забудзь, Арханёле Міхале,
на меч свой, гостры і праведны.

* * *

У самоце маёй
для Цябе
заўсёды ёсць месца.
Спадзяюся,
дакляру ю,
веру ,
што так яно й ёсць.
І... др ыжу ,
і... баюся,
каб Ты
не ўсу мніў ся
аднойчы
ў гэтым.

**Ачышчэнне**

Зніклі,
р астаялі ў мор ы болю
кр ышынкі жадання
знахо дзіць
пр аўду ў няпр аўдзе,
шу каць у мане палёгку ,
каму сьці казаць
салодкія словы
жаданай, пр ыемнай
няпр аўды,
якая лагодзіць ву шы
ды насылае бязду мнае,
ліпу ча-цу кр овае
забыццё.

Бо на шляху пакручастым
(на яго аднойчы,
у гэтым сумніву не маю,
вывеў мяне Божы Провід)
спазнала незразумелы,
нежаданы,
мною тады непрыняты
і такі мне патрэбны
боль.

## Нясканчаная размова

Святар абвясціў з амбону:
«Я грэшны
цалкам такімі ж грахамі,
як вы,
што прыйшлі мяне слухаць сягоння».

Людзі прыціхлі, здзівіліся —
недавер затаіўся ў вачах:
жартуе ці праўду кажа?

«Я — гэткі ж, як вы», —
паўтарыў ён настойліва
і ўніз апусціўся на
прыступку адну
той лесвіцы,
што лучыць амбон з імі,
і адначасна дзеліць
на слухачоў і прамоўцу.

«Я грэшны!»
Лесвіца дзесьці ўжо ззаду

і... знікла.
Ды яны таго не заўважылі:
надта ж нязвыклым было пачутае.

«Дык з намі пайшлі», —
гукнуў хтосьці з іх блазнавата,
забыўшы адразу,
чаго гэтым слотным ранкам
ён выпраўляўся ў храм.

«З намі пайшлі, не губляйма
ўжо болей часу,
а то вунь старыя на лаўках
засумавалі, пачуўшы праўду тваю,
наш настаўнік.
Адна, што прынесла рубель свой
святому Антонію,
заплакала неспадзявана.
Чаго?
Бо святога не толькі ў Антоніі,
але й на зямлі,
захацела знайсці, дурніца.
А гэны падлётак пабег чагось прэч...
Вар'ят!
Заплакаў таксама, а слёзы хавае.
Ну, што ж ты марудзіш, святар?
Мы роўныя з гэнай хвіліны,
калі невядома з якое прычыны
зніклі кудысьці
прыступкі амбону.
Дойлід які ў тым разбярэцца?»

Пайшлі...
Ды хтосьці з іх раптам успомніў,

а дакладней, забыцца не змог:
цалаваць яшчэ трэба ногі,
тыя, цвіком прабітыя...

Святар нахіліўся таксама
да ног,
фарбаваных памадаю
з неразумных чыіхсьці вуснаў
сучасных парафіянак.
Нахіліўся і...
адхіснуўся ўбок,
бо то была... кроў!

І ўзгадаў у той міг:
адбылося ж толькі казанне
пасля святога Евангелля,
калі ён прызнаўся...
Святар узгадаў:
ён не скончыў Імшы!

Тыя чмялямі гудзелі на вуліцы,
нецярпліва чакалі,
а ён з крывёю на вуснах
паволі вяртаўся ў святыню,
дзе некалькі бедных кабетаў
малітвы да Бога ўзносілі
за свайго святара.

Вярнуўся.
Укленчыў прад Ім,
Хто, прыніжаны й гаротны,
на словы свайго абранніка
упарта кожнага дня
сыходзіў на гэты алтар.

Святар прашаптаў ледзьве чутна,
як сын марнатраўны калісьці:
«Дзякуй... Прабач... —
і запытаў раптам горкае: —
Божа, мой Божа,
за што пакараў мяне, грэшнага,
гэтым нялёгкім паклiканнем
да Цябе?»

І здрыгануўся ўсім целам,
ведаў:
Той, да Каго гаварыў,
пакорна прыняў і гэта
ад яго,
каго выбраў калісьці...

«Даруй», — прашаптаў чалавек і заплакаў.
Бог прамаўчаў, як заўсёды...

Размовы не скончыў Спрадвечны —
пакінуў яе на вечнасць.

**Ты пазнаеш?**

Пачакай мяне.
Пачакай.
Я прыйду.
Вось толькі ўсё перайначу,
адолею,
змяню,
яшчэ раз усё праверу,
узважу,

KAMUNIKAT.org

пераліцую,
змяшаю
з маімі ўяўленнямі,
жаданнямі,
трымценнямі,
пошукамі
чагосьці вельмі патрэбнага,
абавязковага,
неадкладнага,
без чаго мне
няўтульна ў космасе
майго адзінага «я».
Пачакай.
Я прыйду...

А Ты?..
Ты, мой Божа,
пазнаеш тады мяне?

* * *

Прыхінуся да дрэўка крыжа,
прыслануюся, каб утрымацца
на хісткіх маіх нагах.
Папрашу,
праглынуўшы гаркоту
крыўды й неразумення:
«Не дазволь,
каб Цябе аднойчы
я пакінула.
Не хачу, каб Ты
самотна
застаўся на гэтых вятрах,

на скразняку
няветлых стагоддзяў
без мяне».

**Шчодрасць**

Не магу знайсці свайго «я»
у гэтым болю.
Ён спавіў маё цела.
Яно знікла кудысьці,
пакуль я шукала палёгкі.
Шукала.
Чакала.
І наракала
на Таго, Хто боль мне паслаў,
падзяліўся
са мною шчодра
сваім велізарным скарбам,
за які я аддзячыць не ўмею.
І таму наракаю да рання,
каб, сустрэўшы нарэшце світанне,
забыцца ў нетрывалай
палёгцы
ды ціха шапнуць:
«Дзякуй. Няхай так заўсёды будзе,
як у гэтым няпэўным світанні...»

Сказаць і зноў усё зблытаць.
Бо ноч праплыла незваротна
і прынесла набытак горкі —
няўдзячнасць маю
за боль.

**Горыч несустрэчы**

Не спаткала Цябе
на сустрэчы,
якую Ты мне прызначыў.

Ты чакаў,
раскінуўшы рукі,
у зычлівым,
такім знаёмым
усім нам жэсце
любові, болю й самоты...

Была зусім побач.
Колькі крокаў
нас раздзяляла,
усяго толькі некалькі крокаў...
Ды маё не гарачае і не халоднае
сэрца,
мае аця жэлыя з гэтай прычыны
ногі
не змаглі адолець
некалькі крокаў,
што нас раздзялялі.

Даруй...

**Любоў**

Яго вялікасць Боль ізноў мяне наведаў,
мы з ім сягоння зноў па-свойску, зноў на «ты».
Ён не чакаў майго на тое запрашэння,
ніколі надта ветліваю не была я з ім.
Не папракнуў, што з ім не прагнула сустрэчы,

абрус не разаслала прад госцем дарагім.
Любіць — заўжды любіў,
хоць і не мог разлічваць на ўзаемнасць,
ды не жадаў сысці, змірыцца,
што не прагну быць абранай ім.

Нахабнік?
Злы герой?
Ці сябар мой найверны,
чыёй сяброўкай быць
я не хачу зусім?
Хутчэй за ўсё,
самотнік,
што знудзіўся самотай
ды прагне раздзяліць яе са мной.

Ад вогнішча таго, што распаліў аднойчы
для тых, каго абраў ды верна палюбіў,
за свет няблізкі уцячы б ад гэткае любові,
бо вернасцю ягонай не даражу зусім.

Ды толькі трэба нам
для незваротнага расстання
жаданая й святая воля
Таго,
Хто боль напоўніцу спазнаў,
ратуючы мяне яшчэ тады,
калі нас не было на свеце —
мяне і майго болю...

...Калі б
была на тое воля
Таго,
Хто боль сумеў прыняць,

і ўзышоў на Крыж.

Дзеля мяне зрабіў Ён гэта.
А ў мяне яшчэ й цяпер няма адвагі
спазнаць і зразумець
такой Любові.

**Тваё Сэрца**

Калі Ты ў зычлівым жэсце,
ад якога
па целе бягуць мурашы,
прапануеш мне
сваё Сэрца,
ненавіджу свой страх,
свой паралюш,
бо яны не заўжды дазваляюць
адказаць узаемнасцю.

**Пад зоркай з пахмурнага неба**

Адсланілі нарэшце абраз
і сказалі, што гэта Ты.

Здрыганулася.
Не пазнала.
Захацелася плакаць ад роспачы,
бо заўжды гэта боязна —
таго не пазнаць,
каго палюбіць паспела,
і таму шукаю настойліва
новых спатканняў,

новых адкрыццяў Цябе.

Адсланілі абраз,
на сустрэчу з Табой запрасілі,
абяцалі: будзе прыгожа й радасна,
будзе ўрачыста й святочна,
як бывае заўсёды ў такія хвіліны.

А сустрэчы не адбылося...

Мне ў твар пераможна
ўсміхалася расчараванне,
шаптала: «Ах, няздольнаю
ды не гатоваю аказалася ты
раздзяліць вялікую радасць!»
Толькі заўчасна
святкавала яно перамогу.
Ды й адкуль яму ведаць было,
што мне таго ж вечара
сустрэча была прызначана
пад самотнаю зоркай
засланага хмарамі неба?
Там ні бронзы пыхлівай,
ні халоднага каменя,
ні людскіх найшчырэйшых усхліпаў,
прад якімі
чамусьці губляюся ды не ведаю,
дзе падзець свае рукі і вочы.

Не было там нічога такога.
Толькі смелая зорка з пахмурнага неба.
Толькі Ты,
Непрадказальны
ў прызначэнні спатканняў.

І я, бясконца шчаслівая,
на той незабыўнай сустрэчы.

...Дзякуй, мой Пане.

## Спадзяванне

Цемру сцюдзёнай начы
разарвала святло.
Промні яго іскрыстыя
асвяцілі
сцюжу
бэтлеемскае стайні.

Промні былі неспадзеўныя,
а святло — ярчэй яркага.
Насельнікі стайні застылі ды —
зусім нечуванае! —
ажно сена перасталі жаваць,
мройліва ўздыхаючы
аб залітых сонейкам пожнях.
А можа пакінулі сена
для вігілійных сталоў,
якія дзіўнаватыя для іх беларусы
на сваёй дзіўнаватай для іх зямлі
засцелюць белым абрусам,
сатканым знарок для такое начы
матчынымі рукамі?
Засцелюць, пасядуць за стол
ды куццю спажываць будуць —
надчэкваць святла першай зоркі,
промні якой
разарвуць нарэшце

цемру сцюдзёнай начы
над радзімай адзінай маёй...

Як тады ў Бэтлееме...

## Пра мяне

«Боль ачышчае», —
несвядома,
бяздумна
і я калісьці
паўтарала
чыесьці
разумныя словы
пра нечы боль.

Казала,
паўтарала,
не мела
жаднай здагадкі,
што яны — пра мяне.

## У несвяточнай ясёнцы

Бабулька на ложку нізенькім
між вялізных падушак,
што дзіцятка малое,
якое сядзець не ўмее.
У вечаровым прыцемку
навобмацак звыклыя пальцы
перабіраюць паволі
пацерынкі ружанца.

Мерна ходзікі цікаюць
у старасвецкім гадзінніку.
Кот малады, няўрымслівы
нітак клубок ганяе
каля бабуліных ног,
якую ён вельмі любіць
і якой вось жа робіць шкоду —
бэрсае ніткі, гарэзнік,
нібы той павук пузаты
над грубкаю закапцелай.
Бабуліны ж рукі раптам
застылі, крыжык намацаўшы,
на пачарнелым ад мноства малітваў
ружанцы.

«Божа, мой Божа!
Ці дараваў Ты мне, грэшнай,
якая калісь басаногая,
без хусткі, але ў ясёнцы
бегла ў цемрадзі ночы,
ратуючы Цела Тваё
ад зганьбавання бязбожнага?

Яны, — бабуля пералжагналася
ды на вакно азірнулася, —
забралі ад нас святара,
у ледзяным турэмным падвале
ў Полацку
трымалі яго, гаротніка.
Такая бяда нечуваная,
а ім, ненасытным,
мала было нашых слёзак.
Дык мелі прыйсці на досвітку

у дом Твой — касцёл наш, Божа,
адным махам меліся знішчыць
усё, што было святое.
Сказалі пра тое мне, Божа,
людзі надзейныя, добрыя.
І я пабегла па цемрадзі,
босая, проставалосая,
толькі ясёнку накінула —
каб прытуліць Цябе, Езу,
схаваць ад сцюжы й нянавісці
ля сэрца майго баязлівага.

Бегла з Табою, Хрыстэ,
праз цёмны, няветлы лес —
да берага выратавальнага
ракі, пачарнелай ад суму.
І далей на плыце — праз раку...
На світанку была ўжо ў Краславе,
дзе ў той час страхавіты
не ганьбавалі яшчэ святыняў
і са святых начынняў
не рабілі сабачых будак...

Даруй мне, о Божа!
Цябе я, грэшная,
несла тады праз ноч,
на тое заслугі не маючы.
Каля сэрца свайго схавала
пад несвяточнай ясёнкаю
дый без патрэбных малітваў —
яны з галавы ўсе выветрыліся.
Божа мой, Божа,
праз непагадзь,
як святы Крыштаф калісьці,

Цябе ратавала, грэшная,
ад рук, што страху не мелі,
ад зледзянелых сэрцаў,
ад апантаных нячыстаю сілай:
яны ўпарта й злосна
называлі сябе змагарамі...

На раннім світанні
ў касцёле краслаўскім,
сляды пакідаючы брудныя,
Твой Насвяцейшы Сакрамэнт
я аддала чалавеку ў сутане...
Ён пахіснуўся, стаў на калені,
а потым са стогнам гаркотным
лёг прад Табою крыжам.
І моўчкі ляжаў так доўга —
плечы адно ўздрыгвалі...

Прысела на лаўку збоку
ды... моцна заснула адразу.
А трэба ж было спавядацца
і біць сябе з жалем у грудзі,
што я, зусім не святая,
тою сцюдзёнаю ноччу,
босая, праставалосая,
несла Цябе, мой Божа,
пад несвяточнай ясёнкаю,
заслугі на тое не маючы...»

...Свечка даўно дагарэла,
кот прыдрамаў, змораны,
на перабэрсаных нітках.
Старэчыя пальцы застылі
на крыжыку ад ружанца...

**Галубка**

«Хоць крышынку адну маленькую
са стала, накрытага шчодра,
для тых,
хто сваёй бездакорнасцю
слепіць грэшныя вочы!..»

Так прасіла яна,
так крычала
адчайным, маўклівым крыкам
палахлівае беднае сэрца.
Прасіла крышынкі літасці,
не маючы спадзявання
на штосьці большае.
Дый што магло быць большым,
больш патрэбным,
больш значным
для яе
ў тую хвіліну сораму й адчаю?

Аціхла, гайданулася,
ды незразумелаю сілай
устояла на шалях вагаў
Яго справядлівасці,
шпурнуўшы на іх
свой груз
непрыгожа-адчайны.
Не мела чым ахінуцца,
апроч слабенькай накідкі
сваёй безразважнай надзеі.
Акрылася ёй, бязважкай, застыла
і ў адчайна аглухлай цішы

пачула... як б’ецца сэрца
трапяткой ахвярнай галубкі —
яе неслі аднекуль цяпер у святыню,
каб аддзячыць за штосьці
Спрадвечнаму.

— *Вера твая цябе ўратавала...*—
пачула й не змагла адразу
паверыць, што гэта — пра яе.
А Ён усміхнуўся стомлена:
колькі магло іх быць
на гэтым месцы цяпер?
Паўтарыў і быццам акрыў грэшніцу
плашчам сваёй міласэрнасці...

...Чыесці слухмяныя рукі
дзесьці там, на падворку святыні
адчынілі клетку-няволю —
галубчыны ўспырхнулі крылы...

**Надзея**

У каламуці дзён,
падораных Спрадвечным,
так шмат сустрэч і спраў,
якіх не адкладзеш на потым,
і пільных шмат размоў,
што вырашаюць лёс.
Туды паспець, там быць,
таго чакаць і прычакаць нарэшце,
каб штосьці вырашыць чарговы раз...
Як гэта важна ўсё, як пільна —
без гэтага не жыць!

Спяшаемся на ўсход,
а заўтра ўжо на захад,
на поўнач і на поўдзень —
хоць бы не зблытаць з ноччу дзень...

Калі ж настане раптам
той міг,
заўжды дачасны й нежаданы,
што на скаку ці на ляту
парушыць
такі абраны рытм,
аддыхаўшыся з большага,
ацершы лоб спатнелы,
адразу вінаватага
ў мітрэнзе нечаканай
шукаць пачнеш, бядоліць,
бо вось жа прыпыніўся бег жыцця...

Ды раптам сярод гэткіх нараканняў,
прэтэнзій да няздзейсненых надзей
аднойчы ад няма чаго рабіць
рукою стомленаю адхінеш фіранку
вечаровага вакна...
І ўбачыш у вакне насупраць
самотны, трапяткі агеньчык свечкі.
Ён асвятляе нечы ўспамін
па блізкім, дарагім, адзіным,
па тым, каго няма ўжо
у каламуці хуткіх дзён,
надзей, трывог і спадзяванняў,
чый бег спыніўся,
альбо яго спыніў нядобры хтосьці.

Агеньчык кволы,

пры якім трымаецца ўпартая надзея.
Хто суразмоўца там, за тым вакном,
дзе трапяткі агонь упарта не жадае знікнуць,
як знік аднойчы той, каго чакае ён?..

Хвіліна ціхае няспешнае малітвы,
размовы з Ім, Спрадвечным,
да Каго спяшаюцца
альбо плывуць паволі нашыя шляхі.

Агеньчык кволы ў чужым вакне
(здавён казалі, чужога не бывае гора),
распалі хвіліну гэту гарачаю малітвай.

**Важнае**

— Ах, як малюе гэты святар карціны!
— А як ён вершы лоўка складае!
— Ды як зухавата забівае гол у футболе!
— Яшчэ ён любіць заморскія кветкі...
— ...якіх у яго не ахопіш вокам!
— Хтосьці казаў, ён яшчэ на гітары...
— ...так-так, грае й спявае ды танчыць прыгожа!
— А ўчора насмяшыў нас усіх —
як жываты не парвалі ад смеху!

Так яны захапляліся
адным маладым ды ўдалым,
адораным мноствам талентаў
святаром —
ён служыў дзесь паблізу
ды нястомна і хвацка
здзіўляў іх штораз новымі талентамі.

— А-а... які ён, скажыце, святар?.. —
сярод гучнага захаплення
неспадзяванае і ледзь чутнае
ўстрэла пытанне.
Пытаўся старэнькі,
дарэшты ссівелы, згорблены,
змучаны, але няскораны
дзікім сталінскім лагерам
тутэйшы святар,
якога яны наведалі сёння.

«Вось так ён заўсёды:
сапсуе размову,
разбурыць ды знішчыць
добры настрой», —
буркнуў пад нос
адзін суразмоўца з дакорам,
хоць услых не сказаў анічога.
Гаспадар нізка галаў звесіў,
цярпліва чакаў,
а госці, гаваркія заўсёды —
у кішэню за словам ніколі не лезлі —
цяпер невядома чаму
не знайшліся што адказаць
дзіўнаватаму старцу.
«Вось ён гэтак заўсёды...» —
з дакорам падумалі
пра старога, але няскоранага
святара.

**Спадак**

У царкву святой Еўфрасінні,
да святой палачанкі
ўваходжу, загадзя вінаватая,
бо жагнаюся ж я не так,
як тыя,
што тут пільнуюць парадак.
Не справа — налева
знак мой святога крыжа, а
злева — направа,
і гэта, як часам пачуеш,
не такая малая загана,
каб не звяртаць на яе ўвагі.
І ўкленчыць мне, можа, захочацца,
а ў гэты час, можа,
трэба маліцца тут, стоячы...

У дарагім майму сэрцу храме
на маёй радзіме,
у стольным Полацку
я, нібы чужаніца,
ужо таму вінаватая,
што...

Мая віна, як цяжар граху
першароднага.
Нас не было
ў шчаслівым Эдэмскім садзе,
а віна прашчураў
дагэтуль гняце нашчадкаў
Адама і Евы.
Не было й праз тысячу год
пасля прышэсця Хрыста,

калі раз’ядналіся,
разарвалі нераздзельную
Яго вялікую спадчыну
для ўсіх нас,
хто ў Яго паверыў,
высокія іерархі.

Хочацца быць тут часцей,
а бываю рэдка.
Не хачу вярэдзіць душу,
але памятаю: я не такая,
як тыя, што сочаць тут
за парадкам.
Цікава, а што сказала б
на гэта
сама святая палачанка?

...Колькі ўваходжу ў царкву
святой Еўфрасінні ў Полацку,
столькі ж чую сябе вінаватаю
за даўнія-прадаўнія,
успадкаваныя мною
грахі.

## Шчасце

Надзеі такой не мела,
не было ў мяне й спадзявання,
не магла падумаць нават,
што мець буду шчасце —
быць паслухмянаю
ды ўдзячнаю,
з раскрытым

наросхрыст сэрцам
вучаніцаю
свайго сына.

* * *

*Хрысціне*

Язміну з твайго гародчыка
можа зайздросціць
кожны куст
пад вокнамі хатаў
з іншых гародчыкаў.

Зайздрошчу і я.
Бо не ўмела пісаць
гэтакіх вершаў
цудоўных
маме маёй.

**Успамін**

З усіх нашых сходаў
пісьменніцкіх
засталіся
трывала ў памяці
кветкі
на прыполе
Ніны Мацяш

**Каляднік**

Каляднік на вакне.
У хаце маёй альбо іншай,
у квецені шчодрай
альбо без яе.

Дзе ні зірну на яго,
прыпомню
чамусьці падобны
да ніцых галінак
на тле марозных узораў
ціхі ўздых пра каляднік,
які ў той год не зацвіў,
паэткі
Валянціны Аксак.

* * *

На падваконні барака —
пальцам, нібы на пяску,
вывела
ў Вялікі Чацвер
абрыс
Хрыста
ў цярновай кароне.
І заслужыла тым самым
карцар
сцюдзёна-лядовы.
У ім і сустрэла
Вялікдзень.

Такою была,

KAMUNIKAT.org

такой засталася
наша
Ларыса Геніюш.

## Падзяка

У дзень Святой Сям'і
ў касцёле
сучасная маці
дзякуе Пану Богу за тое,
што ейныя дзеці
не ўзялі сабе ў спадчыну
ахвоты да чаркі, бязвер'я
ды абыякавасці
да ўсяго святога
іхняга бацькі,
з якім яна
стварыла калісьці
сям'ю.
Як аказалася, не святую.

## Размова з гаспадаром бульдога

«Я таксама ў Бога верыў
да трыццаць дзевятага года,
тады мне было сем гадоў», —
сказаў выпадковы
мой суразмоўца.
Недаравальна кароткаю
была тая наша размова.
Я, як заўсёды ў нядзелю,
спяшалася на святкаванне

Хрыстовага ўваскрасення,
а ён
рудога бульдога
выгульваў
блізу дарогі да храма.
Разбегліся хутка нашы шляхі.
Было тое летась.
Дакорлівай стрэмкаю
засела
тая размова кароткая
ў памяці.
Бо верніца Хрыста Уваскрослага
не запытала,
шыбуючы ў храм на сустрэчу,
чым
гаспадара рудога бульдога
пакрыўдзіў
у трыццаць дзевятым годзе
мой Бог?

**Крыўда**

«Усяму мяне навучыла, —
з крыўдаю застарэлай
казаў чалавек
пра сваю маці, —
толькі не навучыла
найвышэйшай размове,
з Богам.
А сама шмат ведала
і на святы кудысьці ездзіла,
здаецца, у Вільню ці ў Рыгу —
там жа Богу тады яшчэ

не спраўлялі пышных паховінаў.
А ці любіла Яго мая маці? —
запытаў у кагосьці нябачнага
ўголас
чалавек з густой сівізною
на скронях
і сам нібы ўсумніўся разгублена:
— Н-не... ведаю...
Бо хіба магчыма такое:
любіць Яго шчыра
і не падзяліцца гэтакім скарбам
з родным сынам?»

## Лесвіца

У бацькоўскай хаце,
кажуць,
найсаладзейшы сон.
Чаму ж тады ён
адлятаў ад мяне ў вырай,
калі я ў залепленых
трыпутнікам ды крываўнікам
драпінах майго маленства
замест таго, каб заснуць зморана,
кожнага вечара ўзбіралася
ўгору—
пярэчка за пярэчкай —
па бясконца доўгай ды хісткай
лесвіцы,
чый верхні канец абапіраўся
на клубастыя аблокі?
Дарогу тую па лесвіцы
ў неба

часам бачу й цяпер,
нібы наяве,
нібы гэта была не дзіцячая мара,
а досвед выпрабавання.

Пазней разумны тэолаг
тлумачыў,
што лесвіца — вобраз біблійны,
таму, маўляў, правільнымі
былі мары пяцігадовай дзяўчынкі.
Не стала яго расчароўваць,
бо не ведала я тады Бібліі
і знакамітай Якубавай лесвіцы
таксама.

У гэтай дзіцячай гісторыі
было ўсё значна прасцей.
Мне конча трэба было патрапіць
на неба і сказаць Яму,
што тэрмінова, проста абавязкова,
пільней-пільнага
адмяніць Яму трэба
смерць,
якую, прызнаюся, я не любіла.

Ды, на жаль, ці на шчасце
не ўдалося агораць мне
далёкі й высокі шлях.
Змораная падарожніца
засынала ў нязздейсненых мроях
зазвычай
паміж зямлёю і небам,
каторы ўжо раз
адклаўшы гутарку пільную

ў вышніх нябесных сферах —
да наступнага вечара...

## Карціна, якой пакуль няма

Калі б я была мастаком,
намалявала б карціну,
што стаіць прад вачыма,
калі ўспамінаю
дзяўчыну з раскошнай
капой валасаў
колеру спелага жыта.
Яны красаваліся на яе галаве
да таго,
як жудасным скрыгатам
на дарозе яе юнацтва
запозна затармазіла машына...

На ложы цяжкага болю,
у таямнічай,
дарэшты не разгаданай
наступнікамі Гіпакрата
коме
дзяўчына згубіла
капу валасоў раскошных
колеру спелага жыта.

Але я малявала б не гэта.

На карціне майго ўяўлення —
танюткая,
у павуцінцы-сукенцы,
вытканай дбайным сонцам,

дзяўчына
на радасным тле зеляніны
чэрвеньскага луга
трымаецца аберуч
за крыж
з бярозавых бэлек.
Уверсе — высокае неба.
Дзесьці за рамаю — сонца...
Ягоныя промні лашчаць пяшчотна
дзяўчыну з кароткай, пад вожыка,
стрыжкаю,
у тонкай, злёгку кранутай ветрам,
вытканай сонцам сукенцы
і... крыж
з бярозавых бэлек.

Карціна — мой сон
пасля просьбы-малітвы
за дзяўчыну,
у якой таямнічая
кома
на нашых вачах забірае,
а можа, усім нам дорыць,
трэці год яе маладосці.

**Дарога**

Скрыжаванне дарог пужае:
пойдзеш па гэтай — нядоля чакае,
скіруеш на тую — добра падумай,
а выйдзеш на трэцюю —
сустрэнеш такое,
што лепш сядзець дома.

KAMUNIKAT.org

Яшчэ на адным скрыжаванні
гара абяцанак-цацанак:
направа — горы,
налева — рэкі,
а проста — грошы.

На адным скрыжаванні страшна,
на другім гэтак сумна,
што ўсе мухі загінуць могуць.
А я маю свой накірунак.
Яго я спазнала
ў маім паркалёвым маленстве.
Бабуля Францішка
аднойчы вызначыла дарогу:
з Гойдышава — праз Камянкоўку,
па бязлюдным старым гасцінцы,
дзе рэдка на газіках ездзілі
старшыні й парторгі
мясцовыя.
Напэўна, таму й ацалеў там
адзіны на ўсю ваколіцу
счарнелы крыж.
Пры ім мы з бабуляй жагналіся,
я мовіла ўголас пацеры,
бабуля ж наструнена слухала,
ці не наблытае раптам чаго
унучка,
на чый піянерскі гальштук
вочы б старой не глядзелі —
таму ён, вядома, застаўся
дома ў школьным партфелі.
На ўзмежку збіралі жменю суніцаў
ды ўпоруч спорнай хадою —
далей па нашай дарозе:

праз лес — на Задарожжа.
Там, на шчасце, ацалела таксама,
як і наш камянкоўскі крыж,
стромкая наша святыня
з чырвонае цэглы.
Чырвонае мо таму,
што паўстала на самым пачатку
крыважэрнага
стагоддзя дваццатага,
у якім нам з бабуляй Францішкай
лёсіла спаткацца
ды распачаць
наш незабыўны шлях.

...Бабуля мая
была вельмі падобнаю
да мудрай старой грузінкі,
што аднойчы спытала здзіўлена:
«А навошта дарога,
якая не вядзе да святыні?»

**З дапамогай святога Антонія**

Ягнятка ад статку адбілася,
дзесьці малеча прапала
і не бяжыць на бляянне
авечкі старой, спалоханай.

Надрыўна кліча авечка,
і разам з ёй гаспадыня —
Гертруда руплівая з плачам
шукае, кліча ягнятка.
Няма...

Горка бядуюць абедзьве
па крываногім,
бялюткім,
з зорачкаю на лобе
дурненькім ягнятку, што дзесьці
прапала вось, недарэчнае.

Гертруда з ног ужо збілася,
гатовая ў роспачы біцца
з ваўком,
сабакам-зладзюгам
ці нейкім яшчэ там зверам...
І як апошні ратунак —
спынілася,
пералжагналася
ды ўмольна так папрасіла,
да неба вочы звярнуўшы:
«Святы Антоні з Падуі,
які вяртаеш згубленае,
адшукаць памажы ягнятка
з крывымі, дрыготкімі ножкамі,
бялюткае
і з рудаватаю плямкаю
на лобе ягоным дурненькім».

Агледзелася...
Дзе яшчэ не шукала
сягоння
ягнятка сваё памаўзлівае?
У асацэ высачэзнай,
якая рубцуе ногі,
калі па ёй ходзіш босы...

...Стомленае, мурзатае

ягнятка ціха драмала
у асачыных джунглях,
густых, шапаткіх і страшных,
калі ты ў іх без мамы,
няхай сабе і авечкі,
што іншы раз вось жа губляе
дзетак сваіх крываногіх.

Гертруда раптам заплакала,
на гэты ўжо раз ад радасці
і абвясціла ўпэўнена:
«Ніхто і ніколі табе так не паможа,
як добры Пан Бог,
а з Ім і святы Антоні!»

Шчаслівая Герця-Гертруда!
Шчаслівая,
бо крываногіх,
бялюткіх і рудаватых
ягнятак
ды сціплы, някідкі набытак
пасе для яе не хто іншы,
як Бог —
руплівы і вельмі добры.
Падпаскам жа ў справе Ягонай —
Антоні святы Падуанскі,
што рэчы заўсёды вяртае
старым і малым разгублякам,
толькі калі, вядома,
яны шчыра таго папросяць.

Шчаслівая Герця-Гертруда...

**Малітва Божага дзіцяці**

Дзякую, Пане, за лета,
якое я вельмі люблю,
бо летам Ты дорыш так шчодра
столькі ласкавага сонца,
што ажно хапае на ўсіх.
Бягу басанож па лузе,
спяваю Табе хвалу!
Купаюся ў рэчцы гарэзнай
і дзякую за ваду.
Збіраю краскі ў букеты,
каб падарыць усім тым,
каго Ты так моцна любіш —
маме, тату, бабулі і ўсім,
для каго яны — радасць.
Мой Ойча Нябесны!
Я ведаю, як Цябе цешаць
і смех мой, і песня, і рэха,
што адгукаецца радасна
на крык мой шчаслівы:
«Люблю!»
Люблю Цябе, Божа!
Мне добра быць у далонях
бацькоўскіх Тваіх!
Амэн.

KAMUNIKAT.org